**К. Кісялёў**

Старшыня СНК Беларускай ССР

# Змены ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў

Сакавіцкі пленум Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) прыняў пастанову «Аб зменах у палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў», якая мае выключнае значэнне для нашай народнай гаспадаркі, для далейшага ўмацавання калгасаў. Яна ўстанаўляе новыя прынцыпы, на падставе якіх калгасы будуць пастаўляць дзяржаве сельскагаспадарчыя прадукты.

Чым выкліканы змены ў палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў?

Старая сістэма загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў перастала адпавядаць высокаму ўзроўню развіцця нашай гаспадаркі, грандыёзным поспехам калгаснага ладу. Яна стала тармазам далейшага развіцця сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Сельскагаспадарчыя прадукты да гэтага часу загатаўляліся па сістэме, распрацаванай яшчэ ў той перыяд, калі ў сельскагаспадарчай вытворчасці пераважаў прыватны сектар, калі асноўная маса хлеба і ўсіх астатніх прадуктаў вытваралася ў аднаасобных гаспадарках.

Зараз, калі наша сацыялістычная гаспадарка стала магутнаю сілай, калі калгасы ўмацаваліся, становішча карэнным чынам змянілася. Цяпер сельскагаспадарчыя прадукты вытвараюцца амаль выключна ў сацыялістычным сектары, у калгаснай гаспадарцы.

Старая сістэма загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў у свой час адыграла станоўчую ролю, але цяпер, у новых умовах, яна ўстарэла і стала затрымліваць далейшае развіццё грамадскай гаспадаркі калгасаў. Вось чаму ўся гэта сістэма карэнным чынам зменена.

Новае ў палітыцы загатовак заключаецца ў тым, што нормы абавязковых паставак дзяржаве па ўсіх відах сельскагаспадарчай прадукцыі будуць вылічвацца пагектарна, у адпаведнасці з размерамі зямельнай плошчы, замацаванай за калгасам. Акрамя таго, прынцып абавязковых дзяржаўных паставак пашыраецца і на тыя сельскагаспадарчыя прадукты, якія да гэтага часу загатаўляліся іншымі метадамі (кантрактацыя, закупкі і т. д.). Без змен застаецца толькі сістэма загатовак такіх тэхнічных культур як лён, буракі, бавоўна, якія загатаўляюцца праз кантрактацыю.

Новая сістэма загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў, распрацаваная пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна, вырашае вельмі важнае пытанне аб правільным спалучэнні агульна-

дзяржаўных інтарэсаў з інтарэсамі калгасаў і калгаснікаў. Яна будзе стымулам шырокага развіцця калгаснай гаспадаркі ў яе комплекснасці і многаграннасці, прывядзе да ўздыму вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў у нашай краіне, да яшчэ большага ўмацавання калгаснага ладу і далейшага росту заможнасці калгасных мас.

Новая сістэма па-большэвіцку вырашае гістарычную задачу— стварыць багацце прадуктаў у нашай краіне.

Такія палітычныя і эканамічныя асновы змен у палітыцы загатовак і закупак сельскагаспадарчых прадуктаў.

Раней існаваўшы парадак загатовак і закупак прывёў да таго, што ў некаторых калгасаў знікла зацікаўленасць у развіцці сваёй грамадскай гаспадаркі. Для паляводчых культур: зярна, бульбы і іншых—пастаўкі вылічваліся па плану пасеўных плошчаў, а для прадуктаў жывёлагадоўлі—па наяўнасці пагалоўя жывёлы ў гаспадарцы калгаса. Пры такім метадзе некаторыя калгасы імкнуліся паставіць дзяржаве хлеба менш, дабіваліся меншага плана пасеву зернавых.

Кіруючым прынцыпам новай палітыкі загатовак з'яўляецца здача дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў не па плану пасеву, а па колькасці зямлі ў калгасе. Гэта значыць, што ўсе калгасы павінны пастаўляць дзяржаве зернавыя, масліčныя, травяныя і іншыя культуры з кожнага гектара.

Кожны калгаснік добра ведае зямлю свайго калгаса. Ён будзе ведаць, што гектар пахаці—цвёрдая, устойлівая адзінка вылічэння абавязковых дзяржаўных паставак.

Такі парадак паставак забяспечвае для іх устойлівую базу, ліквідуе ўсякія перашкоды для развіцця пасеваў зернавых, бульбы, сланечніка, дасць калгасам магчымасць лепш планіраваць севазвароты, каб узяць ад зямлі ўсё, што яна можа даць.

Зямля, навекі замацаваная за калгасамі,—аснова калгаснага ладу, крыніца калгаснага багацця. Кожны калгас яшчэ больш пачне клапаціцца аб асваенні новых зямельных плошчаў праз асушку балот, раскарчоўку хмызнякоў, узворванне цаліны. А трэба сказаць, што ва ўмовах нашай рэспублікі яшчэ многа зямлі можа і павінна быць асвоена. Пачын калгаснікаў Любаньскага раёна, якія прыступілі да асушкі і асваення балот, сустрэў шырокі водгук і падтрыманне ўсіх калгаснікаў. Новы закон аб пастаўках дасць гэтаму пачынанню яшчэ больш размах.

Гарнцавы збор у агульным паступленні хлеба па БССР займае ўсяго 3—4 проценты. Тым часам на гэтай справе занята 3189 інспектароў, якія раз'язджаюць па млынах. У свой час, калі млыны знаходзіліся ў руках кулакоў, гарнцавы збор быў неабходны. Цяпер-жа ён толькі затрудняе калгаснікам памол і не пакрывае выдаткаў па ўтрыманню інспектарскага апарата і млыноў. На кожным цэнтнеры перамолатага зярна калгасныя млыны нясуць толькі страты. У выніку мясцовая млынная гаспадарка прышла ў заняпад; колькасць млыноў скарацілася, новыя не будаваліся. Сяляне вымушаны былі вазіць хлеб для памолу на аддаленыя дзяржаўныя млыны.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

**З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы**